## ***Прыметнік*** *(6 клас)*

*1. Адзначце правільную фармулёўку:* 1) Прыметнік – гэта часціна мовы, якая абазначае прымету слова; 2) Прыметнік – гэта часціна мовы, якая абазначае прымету прадмета; 3) Прыметнік – гэта часціна мовы, якая абазначае прымету прыметы.

*2. Адзначце прыметнікі:* 1) беленькі; 2) белы; 3) бель; 4) бяліць; 5) бялюткі.

*3. Якія прыметнікі адказваюць на пытанні* ***які? якая? якое? якія?*** *і спалучюцца са словамі* ***вельмі, надта****:* 1) якасныя; 2) адносныя; 3) прыналежныя.

*4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі:* 1) вузкі калідор; 2) летні дзень; 3) нарачанскі край; 4) пясчаная дарога; 5) сестрына хата.

*5. Адзначце словазлучэнні, у якіх прыметнікі маюць якаснае значэнне:* 1) вішнёвы садок; 2) вішнёвыя вочы; 3) сонечная ўсмешка; 4) сонечны прамень.

*6. Прыметнікі якога разраду маюць ступені параўнання:* 1) адносныя; 2) прыналежныя; 3) якасныя.

*7. Адзначце формы найвышэйшай ступені параўнання:* 1) больш яркі; 2) лепшы; 3) найменш зручны; 4) найпрыгажэйшы; 5) самы меншы.

*8. Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы параўнання:* 1) гняды; 2) добры; 3) глухі; 4) дрэнны; 5) чорны.

*9. Адзначце прыметнікі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам:* 1) барадаты; 2) каляземны; 3) міжраённы; 4) падводны; 5) цеплатрывалы.

*10. Выкрасліце ў кожным радзе чацвёрты “лішні” прыметнік:* 1) белы, блакітны, вясёлы, ружовы; 2) высокі, малы, нізкі, палахлівы; 3) добры, залаты, зычлівы, спагадлівы.

*11. Адзначце словазлучэнні мужчынскага роду:* 1) высок… таполя; 2) зл… сабака; 3) шырок… стэп; 4) моцн… боль.

*12. Адзначце сказы, у якіх дапушчаны памылкі ва ўжыванні форм ступеней параўнання:* 1) Два гады працы ў экспедыцыі былі для Міколы самай найбольшай радасцю; 2) Ад лесу трава была гусцейшая і большая; 3) Летась быў высокі ўраджай жыта, а сёлета яшчэ больш вышэйшы.

*13. Вызначце род, лік і склон прыметнікаў:* 1) над чыстым полем ___________________ ; 2) у бязвоблачным небе ______________________ ; 3) з вясёлым настроем _____________________ ; 4) цікавую чытаю кнігу ______________________ ; 5) зімовай дарогай _____________________ .

*14. Ад назоўнікаў, што ў дужках, утварыце і запішыце прыметнікі:* 1) (ластаўка) гняздо _____________________ ; 2) (бабуля) хваляванні ______________________________ 3) (Міхась) прыгоды _____________________ ; 4) (мама) характар __________________ ; 5) (цётка) парада _______________.

*15. Выберыце правільны варыянт напісання суфіксаў прыметнікаў:* 1) кіргі(зс/с)кі; 2) ліпе(нь/н)скі; 3) сакаві(кс/ц)кі; 4) слаўгара(дс/ц)кі; 5) латы(шс/с)кі.

*16. Адзначце словы, дзе прапушчаны НН:* 1) вогне…ы; 2) палымя…ы; 3) племя…ы; 4) сярэбра…ы; 5) тума…ы.

*17. Адзначце прыметнікі, якія пішуцца праз злучок:* 1) горка…салёны; 2) Паўднёва…Афрыканскі; 3) светла…блакітны; 4) ціха…плынны; 5) шахматна…шашачны.

*18. Адзначце словазлучэнні, у якіх НЕ (НЯ) трэба пісаць разам:* 1) далёка (не, ня)ветлівы; 2) (не, ня)высокі ўраджай; 3) (не, ня)пахісны змагар; 4) (не, ня)лёгкая дарога; 5) сонечны, але (не, ня)яркі дзень

*19. Падкрэсліце ўсе прыметнікі як члены сказа:* 1) Вечар чуткі, гутарлівы разносіць гоман, смех шчаслівы; 2) Першыя громы! Сэрцу вы мілы, люб мне ваш смех паміж гор, міл майму сэрцу гоман далёкі, водгук вясёлы і шум; 3) Ноч светлая, месячная.